# Білет 22

**Практычнае заданне.**
**Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIX-пачатку XX ст.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія галіны прамысловасці развіваліся ў Беларусі ў пачатку XX ст.?
2. Хто такія часоваабавязаныя сяляне?
3. Па Указе Мікалая II ад 9 лістапада 1906 г. кожны гаспадар дома, які валодае надзельнай зямлёй па абшчынным праве, можа патрабаваць ўмацавання за сабой у асабістую ўласнасць належнай яму часткі з азначанай зямлі; а кожны гаспадар дома, за якім замацаваныя ўчасткі надзельнай зямлі, мае права патрабаваць, каб грамадства вылучыла яму ўзамен гэтых участкаў адпаведны ўчастак у адным месце...».
Якія мерапрыемствы Сталыпінскай аграрнай рэформы адпавядалі гэтым палажэнням Указа?
4. Складзіце схему (або «лагічны ланцужок»): "Прычыны і наступствы Сталыпінскай аграрнай рэформы".

**I. З Маніфеста аб адмене прыгоннага права** *(19 лютага 1861 г.)*

У сілу азначаных новых палажэнняў прыгонныя людзі атрымаюць у свой час поўныя правы свабодных сельскіх абывацеляў.

Памешчыкі, захоўваючы права ўласнасці на ўсе землі, якія належаць ім, прадастаўляюць сялянам, за ўстаноўленыя павіннасці, у пастаяннае карыстанне сядзібную іх аселасць і звыш таго, для забеспячэння побыту іх і выканання абавязкаў іх перад урадам, вызначаную ў палажэннях колькасць палявой зямлі і іншых угоддзяў.

Карыстаючыся сім пазямельным надзелам, сяляне абавязаны выконваць на карысць памешчыкаў вызначаныя ў палажэннях павіннасці. У гэтым стане, які ёсць пераходны, сяляне называюцца часоваабавязанымі.

Разам з тым ім даецца права выкупляць сядзібную іх аселасць, а са згоды памешчыкаў яны могуць набываць ва ўласнасць палявыя землі і іншыя ўгоддзі, адведзеныя ім у пастаяннае карыстанне. З набыццём ва ўласнасць пэўнай колькасці зямлі сяляне вызваляцца ад абавязкаў да памешчыкаў па выкупленай зямлі і ўступяць у рашучы стан свабодных сялян-уласнікаў.

**II. Сталыпінская аграрная рэформа** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. Канец XVIII–пачатак XX ст. 8 клас»)*

У пачатку XX ст. у беларускай вёсцы захоўваліся феадальныя перажыткі: памешчыцкае землеўладанне і малазямелле сялян. Незадаволенасць сялян сваім становішчам стала прычынай іх удзелу ў рэвалюцыі 1905—1907 гг.

Царскі ўрад даручыў правядзенне аграрнай рэформы П.А.Сталыпіну. Эканамічная мэта рэформы заключалася ў забеспячэнні ўмоў для хуткага развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы пры захаванні памешчыцкага землеўладання. Палітычнай мэтай рэформы было стварэнне слоя заможных сялян (сельскай буржуазіі), як апоры царскага ўрада ў вёсцы.

У адпаведнасці з рэформай сяляне атрымлівалі права на выхад з абшчыны і замацаванне надзельнай зямлі ў асабістую ўласнасць.

Сялянскай сям'і мог адводзіцца вотруб - адасоблены надзел зямлі, выдзелены з сельскага абшчыннага землекарыстання ў адным месцы ўзамен «палос» зямлі ў некалькіх месцах. Пры гэтым селянін не пераносіў сваю сядзібу на гэты надзел, а заставаўся жыць у вёсцы.

Рэформа заахвочвала таксама перасяленне сялян з вёсак на хутары - адасобленыя ўчасткі зямлі, куды сяляне пераносілі ўсю сядзібу і сельскагаспадарчы інвентар.

У 1909-1911 гг. абшчыну пакінулі дзясяткі тысяч сялян Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Для сялян Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, дзе з часоў правядзення валочнай памеры існавала падворнае землекарыстанне, Сталыпінская рэформа не мела істотнага значэння. Тэмпы выхаду сялян на хутары ў Беларусі былі больш высокія, чым у цэнтральных еўрапейскіх губернях Расійскай імперыі. За гады Сталыпінскай рэформы колькасць хутароў у беларускіх губернях склала 12% ад усіх сялянскіх двароў.

Адным з напрамкаў Сталыпінскай аграрнай рэформы была перасяленчая палітыка. З перанаселеных губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, каб аслабіць там "зямельны голад", сялянства накіроўвалася ў азіяцкую частку Расіі, Сібір.

У перыяд правядзення Сталыпінскай аграрнай рэформыназіраліся пашырэнне пасяўных плошчаў, рост сельскагаспадарчай вытворчасці. Больш актыўна выкарыстоўваліся сельскагаспадарчыя машыны, мінеральныя ўгнаенні. Стабільнымі сталі ўраджаі. Заможныя сялянскія гаспадаркі паступова ўключаліся ў таварна-грашовыя адносіны, прапаноўвалі сваю прадукцыю для продажу на рынак. Разам з тым, разбурэнне сельскай абшчыны стварыла ўмовы для рэалізацыі "амерыканскага" шляхі развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Для большасці бедных сялян зямельнае пытанне засталося нявырашаным.

## III. Картасхема “Прамысловасць у 1913 годзе”

